УДК 357. 23 (091) “1913” (476.6)

# ПАЛІТЫЧНЫ ПАРТРЭТ ГАРАДЗЕНСКАГА АГРАНОМА ПАЎЛА МІНКОВА: ПАВОДЛЕ «САКРЭТНАГА» ДАНОСУ

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Запознены працэс палітычнай мадэрнізацыі Расійскай імперыі на пачатку XX ст. прывёў да ўзнікнення і развіцця сеткі партыйных арганізацый, якія мелі свае структуры на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку ў Гарадзенскай губерні. Партыйны падзел прайшоў па дзяржаўных служачых, стаў дадатковай падставай для канфліктаў і інструментам маніпуляцый. Адзін з такіх канфліктаў меў месца ў структуры агранамічнай службы Гарадзенскай губерні ў 1913 г. Прычынай адкрытага супрацьстаяння стала звальненне з пасады агранома гарадзенскай землеўладкавальнай камісіі Мікалая Крэставаздвіжанскага. Як сведчыць пасведчанне, выдадзенае в. а. гарадзенскага віцэ-губернатара ад 13 лістапада 1913 г., Мікалай Крэставаздвіжанскі працаваў на пасадзе агранома пры Берасцейскай павятовай землеўладкавальнай камісіі з 14 жніўня 1910 г. і да *“выканання сваіх абавязкаў адносіўся вельмі добрасумленна, выяўляючы выканаўчы імпэт і любоў да справы”* [1, арк. 318]. Тым не менш, гарадзенскі губернскі аграном Павел Мінкоў знайшоў летам 1913 г. прычыну для звальнення свайго падначаленага, што сам М. Крэставаздвіжанскі, а таксама яго аднадумцы палічылі наўмысным палітычна матываваным рашэннем, якое належала адмяніць праз выкарыстанне фармальных і нефармальных сродкаў.

Ціск на П. Мінкова меў на мэце дыскрэдытацыю яго ў вачах гарадзенскага губернатара. Дзеля гэтага была задзейнічана вертыкаль *“Рускага народнага саюза імя Міхаіла Архангела”* (РНСіМА), чарнасотніцкай палітычнай арганізацыі, якая мела сваіх людзей у Дзяржаўнай Думе. Справа М. Крэставаздвіжанскага дайшла да сталіцы імперыі і кіраўніка РНСіМА – скандальна вядомага думскага дэпутата У. Пурышкевіча, які адрасаваў гарадзенскаму губернатару афіцыйны ліст-пратэст з патрабаваннем разабрацца ў справе *“несправядлівага звальнення”* [1, арк. 43]. Для абгрунтавання просьбы да ліста была далучана копія паведамлення Берасцейкага аддзела РНСіМА [1, арк. 44-45]. Менавіта гэты тэкст, які захаваўся ў якасці дадатку да ліста У. Пурышкевіча, з’яўляецца каштоўнай крыніцай звестак пра гарадзенскага губернскага агранома Паўла Фёдаравіча (Тодаравіча) Мінкова – сына знакамітага балгарскага педагога і асветніка Тодара

(Фёдара Мікалаевіча) Мінкова, большая частка жыцця якога прайшла ў Расійскай імперыі, а апошнія гады жыцця былі звязаныя з Беларуссю [2].

Сыходзячы з логікі У. Пурышкевіча, на гарадзенскага губернатара рашучым чынам павінна была паўплываць інфармацыя (для большай доказнасці пазначана грыфам "сакрэтна"), якую сабралі ў Берасцейкім аддзеле РНСіМА, актыўным сябрам якога (у тым ліку старшынёй, а на лістапад 1913 г. ганаровым намеснікам старшыні) з'яўляўся аграном М. Крэставаздвіжанскі. На сходзе аддзела 8 лістапада 1913 г. берасцейкія чарнасоценцы, баючыся страціць свайго актывіста, звярнуліся да У. Пурышкевіча з просьбай знайсці магчымасць паўплываць праз каго-небудзь з "членаў Міністэрства Унутраных Спраў" на гарадзенскага губернатара Вадзіма Шэбеку, каб М. Крэставаздвіжанскага пакінулі працаваць у Берасці і адначасова дазволілі яму сумяшчаць некалькі пасад: у структуры РНСіМА (на чале Сельскагаспадарчага таварыства) і ГУЗіЗ у якасці агранома. Прычыны такога манеўру для У. Пурышкевіча выкладаліся наступным чынам: губернскія аграномы знаходзіліся ў губернскім падпарадкаванні і не залежалі ад Міністэрства Земляробства [1, арк. 44].

З мэтай надання большай аргументацыі У. Пурышкевічу для ціску на П. Мінкова берасцейскія чарнасоценцы склалі паўнавартасны "партрэт" губернскага агранома, каб не было сумненняў у выразным "палітычным" падтэксце справы. Дзеля гэтага яны прывялі цэлы шэраг доказаў адмоўнага стаўлення *"агранома А. Ф. Мінкава да нацыянал-правай справы"*. Паколькі такая спецыфічная арганізацыя, як РНСіМА, не знайшла прафесійных недахопаў у М. Крэставаздвіжанскага, то ўбачыла прычыны звальнення ў палітычнай арыентацыі П. Мінкова, які *"па сваіх палітычных перакананнях – левы (дакладней – кадэт) і пастаянна выказваў Крэставаздвіжанскаму сваё неадабрэнне за ўдзел у правых партыях"*. Цікава, што ў тэксце прыводзіліся нават прамыя цытаты з П. Мінкова: *"несумленна ўдзельнічаць у правых, дазволеных Урадам, арганізацыях, калі таварышам нельга працаваць у левых"*. Далей былі дададзены аргументы з іншага боку: *"З'яўляючыся заможным абшарнікам Кобрынскага і Пінскага паветаў, Мінкоў сябруе з палякамі і цалкам знаходзіцца пад іх уплывам, а ўся дзейнасць Крэставаздвіжанскага была накіравана супраць левых і палякаў"*. Яшчэ адным фактам, які сведчыў пра "антырускі" характар дзейнасці П. Мінкова, было яго спрыянне Берасцейскаму сельскагаспадарчаму таварыству (БСГТ), якое знаходзілася пад кантролем польскіх абшарнікаў. Ідучы ў рэчышчы прапольскай лініі папярэдняга губернатара Віктара Барзенка, губернскі аграном наўмысна прапаноўваў *"свае паслугі гэтаму таварыству па абследванні ў*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

*Кобрынскім павеце свойскай жывёлы, пераважна ў польскіх абшарнікаў"*. Акрамя таго, сцвярджалася, што БСГТ нібы атрымала ад Дэпартамента Земляробства на абследаванне 5000 рублёў, а П. Мінкоў прапанаваў для гэтага сваіх аграномаў, якія павінны былі ажыццяўляць дапамогу сялянам, а не абшарнікам. Выснова была відавочнай: П. Мінкоў зрабіў гэта, *"каб дагадзіць палякам-кіраўнікам [Берасцейскага] Сельскагаспадарчага таварыства"* і з мэтай шкоды, а па магчымасці, спынення дзейнасці *"патрыятычнага рускага Сельскагаспадарчага таварыства"* праз пазбаўленне працы яго заснавальніка – Крэставаздвіжанскага. Лагічным фіналам гэтага тэксту было выяўленне цэлай групоўкі *"Мінкоў і К°"*, мэтай якой было *"выжываць рускіх і прымаць [на працу] палякаў (левых)"*. П. Мінкоў у рэзюмэ берасцейскай арганізацыі РНСіМА прадстаўлены як бескампрамісны і помслівы чалавек з шырокім спектрам небяспечных для імперыі перакананняў, асобай, якая была ў стане маніпуліраваць губернатарам і "тэрарызаваць" падначаленых. Вынікам яго дзейнасці стала тое, што многія чыноўнікі і супрацоўнікі дзяржустаноў сталі баяцца ісці шляхам Крэставаздвіжанскага і адмовіліся ад удзелу ў правых арганізацыях [1, арк. 44 адв.-45 адв.].

Разынкай сфабрыкаванага "партрэта" губернскага агранома стала прэзентацыя яго "напалеонаўскага" плана поўнай канцэнтрацыі ўлады над агранамічнай дапамогай у Гарадзенскай губерні: дзеля дасягнення гэтага П. Мінкову інкрымінаваўся "падкоп" пад асобу ўрадавага агранома па Гарадзенскай губерні, П. Лешчанку, які быў ганаровым сябрам берасцейкага аддзела РНСіМА [1, арк. 45 адв.].

Спецыфіка чарнасоценскай арганізацыі прадвызначыла асаблівасці і фармулёўкі абвінавачання П. Мінкова. Тэндэнцыйнасць лёгка фіксуецца ў самой тэхналогіі змешвання сацыяльных і нацыянальных матываў. Больш таго, відаць, М. Крэставаздвіжанскі з таварышамі так і не зразумелі, якіх поглядаў прытрымліваўся яго начальнік-абшарнік (левы, кадэт). Чарнасоценцам складана было ўявіць, чаму П. Мінкоў не быў скрайне правым, магчыма, таму што яны не ведалі, ці не жадалі ведаць, пра балгарскае паходжанне губернскага агранома, што стала б дадатковай падставай для сумненняў у яго добранадзейнасці. Падрабязна падрыхтаваная даведка, а па сутнасці, данос на П. Мінкова, дайшла да гарадзенскага губернатара, але пажаданага эфекту не дасягнула. "Праўда" пра палітычныя перакананні П. Мінкова не прымусілі шукаць яму замену. Тагачасны губернатар В. Шэбека, напэўна, разумеў сутнасць канфлікту і не даў ход справе. Доказам з'яўляецца тое, што тэкст з пазнакай "сакрэтна", змайстраваны



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

берасцейскімі дзеячамі РНСіМА, апынуўся ў звычайным россыпу папераў, якія датычыліся дзейнасці аграмамічнай структуры ГУЗіЗ.

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ у Гродна. Ф. 868. В. 2. Спр. 4.
2. www/ru.m.wikipedia.org/wiki/.

УДК 357. 23 (091) “1914” (476.76)

## У РАМКАХ ЗМАГАННЯ З «БЕЗРАБОЦЦЕМ»: МУЗЕЙНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА ГАРАДЗЕНСКАГА ГУБЕРНСКАГА АГРАНОМА ПАЎЛА МІНКОВА Ў 1914 Г.

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Пачатак Першай сусветнай вайны стаў апошнім этапам дзейнасці структур дзяржаўнай сельскагаспадарчай дапамогі, якая ў Гарадзенскай губерні набыла сталы характар з канца першага дзесяцігоддзя XX ст. Размяшчэнне губерні непадалёк ад тэатра вайсковых дзеянняў, прызыў у армію сялян і супрацоўнікаў структур, якія аказвалі сельскагаспадарчую дапамогу, а таксама скарачэнне фінансавання адбіваліся на працы гарадзенскіх аграномаў. Сітуацыя, аднак, не ўсім падавалася безнадзейнай, а аграномы-супрацоўнікі ГУЗіЗ па губерні нават знаходзілі магчымасць апраўдаць сваё ўтрыманне дзякуючы навукова-культурным ініцыятывам.

Адна з іх была зафіксавана ў “цыркулярным” звароце ад 28 жніўня 1914 г. гарадзенскага губернскага агранома Паўла Мінкова да ўсіх *“Аграномаў і Інструктараў па асобным накірункам Гарадзенскай Губерні”*. Гэты дакумент захаваўся ў архіве Гарадзенскай асаблівай агранамічнай нарады [1, арк. 42-42 адв.].

На пачатку сваяго паслання П. Мінкоў даволі шчыра канстатаваў, што *“на гэты час, насуперак таму, што кажуць, наша праца зведзена да мінімуму і з’яўляецца хутчэй паўпрацай, чым працай у поўным сэнсе гэтага слова”*. Тым не менш, разумеючы рэальнасць бягучых падзей, губернскі аграном бачыў магчымасць знайсці карысны эфект ад існавання агранамічнага персаналу і, такім чынам, уберагчыся ад абвінавачанняў у *“гультайстве”*. Альтэрнатыву агранамічнай дапамогі П. Мінкоў уяўляў наступным чынам: на яго думку, наступіў той самы зручны момант, каб *“заняцца збіральніцтвам усяго таго, што можа стаць такім неабходным для нас, аграномаў, а ўласна заняцца вывучэннем нашай губерні як з пункту гледжання натуральнай*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ